*аблогам ляжаць* — *to be seriously ill*, быть тяжело больным. *Жонка аблогам ляжала*. Міх.

Ня ўсі значаньні слоў падаюцца тут, але толькі патрабнейшыя ў вумовах эміґранцкіх. Звычайна ля кажнага слова паказана месца запісу; калі слова запісана ў малой мясцовасьці (сяле, местачку), тады звычайна падаецца й павет або раён тае мясцовасьці. Калі слова выпісана з кнігі і пад., тады ў дужках падаецца з чаго выпісана. Гэта, казаў той, мэтрыка слоў, падаецца скарачэньнямі. Дагэтуль ужыты наступныя скарачэньні:

Гсл. — М. Гарэцкі. Невялічкі беларуска–маскоўскі слоўнік, выд. 2–ое, у Вільні 1921 г.
Дсл. — В. Добровольский. Смоленский областной словарь, у Смаленску 1914 г.
Ксл. — М. Касьпяровіч. Віцебскі краёвы слоўнік. Міх. — сяло Міхалкавічы Лагойскага павету.
Нсл. — Беларускі слоўнік І. Насовіча.
Ст. — Сяло Старына Ігуменскага пав., словы выпісаны із слоўніка М. Шатэрніка.
Сц. — Слуцкі павет.
Шсл. — М. Шатэрнік. Краёвы слоўнік Чэрвеншчыны, у Менску 1929 г.
Юрсл. — Г. Юрчанка. Дыялектны слоўнік (з гаворак Імсьціслаўшчыны), у Менску 1966 г.

Ведама, словаў ужываюць ня толькі ў месцу іх запісу, але шырэй, звычайна па ўсім краю.

# Да палітычнае арганізацыі

Палітычная эміграцыя ня можа ня мець палітычнае арганізацыі. Найзвычайнейшаю ж палітычнаю арганізацаю, ды дагэтуль, бадай, найлепшаю, ё партыя.

Праўда, некаторыя ня любяць партыяў за зваду памеж партыяў, за несправядлівыя дачыненьні партыі да беспартыйных і да сяброў іншае партыі. Але ўсё гэта бывае, як мы ведаем, і бяз партыяў. Менаваныя заганы партыяў тым меншыя, чым грамадзтва болей выраблена. Прыкладам, іх шмат меней у Задзіночаных Гаспадарствах Амэрыкі, чымся ў бытай Расіі або межваеннай Польшчы. Пры большай вырабленасьці грамадзтва менаваных заганаў можа ня быць. Што ж да камуністычнае партыі, асабліва ў гаспадарствах, у каторых яна мае ўладу, то яе партыяю назваць нельга, бо там дыктатура аднаго, што апынуўся на чале партыі. Сталін або Брэжнёў ня розьняцца сваёю ўладаю ад Гітлера.

У партыі не толеруюць, ня церпяць пагуднае (заганнае, калі ўжыць іншага слова) дзейнасьці сваіх сяброў, як гэта бывае ў варганізацах, паўсталых подле іншых прынцыпаў, ідзе (дзе) такая толеранца вядзець да дэмаралізацыі й нацанальнае шкоды. У партыі людзі вырабляюцца ідэялёгічна, вядзецца палітычнае ўзгадаваньне ў нутры партыі і ў дзеяльнасьці яе навонкі.

Людзі неадукаваныя, каторыя ў жыцьцю культурным могуць быць толькі спажываньнікамі, у партыі добра вырабляюцца, разьвіваюцца й бываюць дзейнымі ім прыступнейшыя агульныя справы палітычныя, чымся культурныя, ня кажучы праз (пра) навуковыя. Бяз партыі неадукаваныя бываюць пакінены толькі радзіме (сям'і), калі яна ё, або гарэлцы; бяз партыі яны болей а болей стаюцца неграмадзкімі.

З партыяю лёгка паразумецца ў кажнай справе, што асабліва добра ў важных справах неадвалочных. Прымеж тога, у грамадзтве беспартыйным даводзіцца паразумявацца з кажным асобна, што немагчыма.

Тыя, што супроці партыі, ня кажуць, чым партыю можна заступіць, бо, прынамся на эміграцыі, партыі нічым заступіць нельга.